№ 20 (613), май 2016 года






# «Экавясна і маладосць» у Палацы Рэспублікі

***Сталічны ўніверсітэт культуры і мастацтваў з 29 красавіка па 1 мая правёў юбілейную – X Міжнародную навуковую канферэнцыю «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання». Акрамя традыцыйных імпрэзаў канферэнцыі – навуковых пасяджэнняў, этнаграфічнага канцэрта носьбітаў традыцыяў «Фальклор беларускай глыбінкі», вечарыны побытавага танца і дударскай музыкі «Фолк прайм», мастацкай рэканструкцыі свята (сёлета гэта быў Вялікдзень) у музеі-скансэне ў вёсцы Азярцо – у праграме канферэнцыі ўпершыню з'явілася новая. Гэта выстаўка акварэльнага і інтэр'ернага жывапісу, аб'яднаная з прэзентацыяй этнаграфічнага фільма ў галерэі «Універсітэт культуры» Палаца Рэспублікі.***

З 2007 года, калі ўніверсітэт заклаў традыцыю правядзення веснавога навуковага форуму, прысвечанага ахове і пераемнасці народнай культуры, яго ўдзельнікі заклікалі да паслядоўнага вывучэння ўсіх бакоў аўтэнтычнага фальклору і ўсіх магчымых шляхоў яго адаптацыі да сучаснасці. Дзесяцігадовы досвед канферэнцыі сведчыць, што такі падыход меў рацыю і пачынае прыносіць плён. У Беларусі найбольш «сенсітыўныя» (пачуццёвыя. – «КГ») і «паглыбленыя ў аўтэнтыку» даследчыкі напрыканцы XX стагоддзя адчулі і аб'ектыўную неабходнасць «звароту да каранёў», і абмежаванасць «вузкадысцыплінарнага» падыходу да этнакультуры. Пра гэта неаднаразова пісалі, напрыклад, філосафы Уладзімір Конан і Мікола Крукоўскі, якія мелі шмат сяброў і аднадумцаў у асяродку спецыялістаў па фальклоры. Дзякуючы інтуіцыі і пасіянарным намаганням айчыннай народазнаўчай навуковай супольнасці, беларусы маюць, напрыклад, выдатныя пізкі гратэскна-эпічных антрапалагічных фільмаў Зінаіды Мажэйкі, якая пачынала як этнамузыколаг, і дакументальна-навелістычных фільмаў Рэгіны Гамзовіч, якая пачынала як журналіст. Сінхронна-рэгіянальны кампаратыўны «зрэз» аўтэнтычнага фальклору краіны мілеініуму занатаваны ў шматтомным фальклорным зборы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», аўтарскі калектыў якога на чале з вучаніцай З. Мажэйкі Тамарай Варфаламеевай, філолагам Аленай Боганевай і этнахарэолагам Міколам Козенкам атрымаў за сваю працу спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. Падобныя тэндэнцыі на сінтэтычнасці і шматбаковасці падыходу да фальклорнай спадчыны характэрныя і для суседніх краінаў. Пра ўсё гэта было паслядоўна дакладзена на пленарным і секцыйным пасяджэннях канферэнцыі з удзелам такіх выбітных даследчыкаў, як этнамузыколаг Т. Варфаламеева (Беларусь), этнаарганолаг Богдан Матлаўскі (Польшча), акадэмік Ігар Мацііеўскі (Расія), культуролаг Вітаўтас Лукшас (Літва), мастацтвазнаўца і музыка-віртуоз Руслан Кайшыбасў (Казахстан).



Адпрацаваная за 10 гадоў форма правядзення канферэнцыі (дзе навукоўцы ўзаемазваротна кантактуюць і з носьбітамі, і з пераемнікамі традыцыі, якія, у свой час, таксама ўзаемадзейнічаюць паміжсобку) «пакрывае» значную пляшчыню сацыякультурнай практыкі, накіраванай на ахову і папулярызацыю фальклору ў XXI стагоддзі. На этнаграфічных канцэртах аўтэнтычныя гурты ўсіх рэгіёнаў Беларусі маюць магчымасць паказаць сваё мастацтва. У рамках пост-фальклорных канцэртаў, што звычайна праводзяцца на канферэнцыі ў фармаце вечарынаў побытавага танца і дударскай музыкі, упершыню заяўляе пра сябе шмат фальклорнай моладзі краіны, якая працягвае традыцыі носьбітаў карэннага мастацтва Беларусі. Майстар-класы ў межах канферэнцыі акцэнтуюць увагу на актуальныя формы і метады працы з фальклорнай спадчынай.

Пад час інавацыйнай для фармату канферэнцыі імпрэзы «Экавясна і маладосць»,



Рэгіна Гамзовіч

што адбылася ў галерэі «Універсітэт культуры», трохмернае «жывое» выкананне традыцыйных найгрышаў капэлай беларускіх народных інструментаў са студэнтаў БДУКМ была аб'яднаная адзіным перформансам з двухмернай рэчаіснасцю антрапалагічнага фільма паводле сцэнарыя Р. Гамзовіч («Абрад Чырачка, альбо як у Тонежы вясну гукаюць») і з выстаўкай акварэльнага жывапісу братоў Арцюховых паводле фальклорных матываў. Тэмы фільма і выстаўкі «перакрыжаваліся» (сярод карцінаў – партрэт антраполага З. Мажэйкі, якая дзесяцігоддзямі даследавала Тонеж і яго абрад Чырачка), шмат візуальных сюжэтаў і музычных сугуччаў адпольскавага напрамку «пераходзілі» з вадкакрышталічнага экрана на аркушы акварэляў і на жывое мастацтва маладых музыкаў і потым – наадварот... Менавіта гэта дало магчымасць наведнікам адчуць і прыгажосць, і жыццёвую сілу этнічнага мастацтва беларусаў, яго этнаэкалагічнасць і ўкаранёнасць у структуры паўсядзённасці жыцця нашага народа. Падаецца, мы прысутнічалі пры нараджэнні новай сінкрэтычнай формы папулярызацыі фальклору і яго самасцвярджэння ў наш час.

***Пра тое, што этнічнае мастацтва застаецца актуальным у XXI стагоддзі, сведчыць і статыстыка: у канферэнцыі 2016 года ўдзельнічалі 110 даследчыкаў з 10 краінаў (Беларусь, Расія, Украіна, Польшча, Літва, Латвія, Бельгія, Малдова, Казахстан, Кітай), з іх – 6 дактароў навук і 20 кандыдатаў навук, шмат маладых даследчыкаў. За ходаю падрыхтоўкі і правядзеннем канферэнцыі можна была сачыць на афіцыйным сайце ўніверсітэта buk.by.***

Энгельс ДАРАШЭВІЧ,
доктар філасофскіх навук,
прафесар БДУКМ
Фота Наталі КУПРЭВІЧ



Браты Арцюховы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУ